*Н.Я.ПЕТУШКО*

# САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ МІСІЯ БІБЛІЯТЭКІ ДЛЯ СЛЯПЫХ

У сучасных умовах рэфармавання грамадства змяняецца сацыяльная палітыка дзяржавы ў адносінах да асоб з фізічнымі і (ці) псіхічнымі адхіленнямі ў развіцці. Пытаннямі іх сацыяльнай рэабілітацыі ў Рэспубліцы Беларусь займаюцца розныя дзяржаўныя і грамадскія інстытуты, сярод якіх важная роля належыць бібліятэцы для сляпых як цэнтру па сацыяльна-педагагічнай праблематыцы.

Лічым неабходным звярнуць увагу на існуючыя азначэнні паняцця “сацыяльна-педагагічная дзейнасць”, хаця адрозненні іх паміж сабою не вельмі істотныя. Сацыяльна-педагагічная дзейнасць у працах А.І. Арнольдава, Ю.В. і Т.А. Васільковых, Ю.А. Стральцова вызначаецца як пазітыўная дзейнасць, у рамках якой пераплятаюцца працэсы фарміравання асобы і грамадскіх адносін. Зразумела, у аснове гэтай дзейнасці, на наш погляд, павінна ляжаць праца, накіраваная на неабходную падтрымку і дапамогу чалавеку ў рашэнні яго асабістых праблем.

Удакладняючы трактоўку тэрміна, мы упэўнены, што пад сацыяльна-педагагічнай дзейнасцю мэтазгодна разумець мэтанакіраваную сістэму дзеянняў, якая арыентавана на аказанне псіхолага-педагагічнай дапамогі і падтрымку чалавека ў рашэнні ім грамадскіх і асабістых праблем. У ёй спалучаюцца сацыяльная і педагагічная работа.

Паводле А.І. Арнольдава, узнікненне сацыяльнай работы звязана з узнік-неннем феномена сацыяльнасці [1,с.99]. Як вядома, слова “сацыяльны” (ад лац. social – агульны, грамадскі) мае значэнне сутнасці ўсяго міжчалавечага, менавіта той субстанты, што адносіцца да сумеснага жыцця людзей і формаў іх зносін. Трансфармацыя ролі сацыяльнай работы ад дабрачыннай дапамогі тым людзям, якія знаходзяцца ў цяжкім становішчы, да фарміравання спрыяльных умоў для іх сацыяльнай карыснасці і актыўнасці ажыццяўлялася на працягу шматвяковой гісторыі чалавецтва. У сучасных умовах яна накіравана на асобу з мэтай паляпшэння ці аднаўлення яе здольнасці да сацыяльнага функцыянавання. У той жа час без педагагічнай накіраванасці, без арыентацыі на ўнутраны свет чалавека сацыяльная работа страчвае свой гуманістычны сэнс.

Педагагічная сутнасць сацыяльнай работы выяўляецца ў стварэнні унікальных умоў, якія садзейнічалі б нейтралізацыі псіхалагічнага дыскамфорту асобы і забяспечвалі яе свабоднае развіццё ў соцыуме. Такім чынам, своеасаблівым відам сацыяльнай работы з’яўляецца педагагічная. Пры гэтым уплыў апошняй распаўсюджваецца на ўсе ўзроставыя перыяды чалавека і ажыццяўляецца не толькі сацыяльнымі педагогамі, але і рознымі грамадскімі інстытутамі. Калі ў першым выпадку гэта дзейнасць, якая адносіцца да сферы прафесійнай, то ў другім яна – агульнапедагагічная, якую можа ажыццяўляць кожны чалавек у адносінах да самого сябе з мэтай самаадукацыі і самавыхавання. У бібліятэцы для сляпых ажыццяўляецца і прафесійная, і агульнапедагагічная дзейнасць. Межы паміж імі, зразумела, умоўныя.

На думку вядомага бібліятэказнаўцы У.І. Цярошына, педагагічная дзейнасць накіравана на дасягненне трох мэт: 1) навучанне людзей, узбагачэнне іх ведамі; 2) выхаванне ў іх пэўных асабістых якасцей; 3) адукацыю як інтэгральны вынік навучання і выхавання [4,с.9]. Такім чынам, педагагічная дзейнасць накіравана на навучанне (аб’ядноўваючы ў адзінае цэлае працэсы выхавання і навучання), развіццё і падрыхтоўку чалавека да выканання пэўнай сацыяльнай ролі ў грамадстве. Асноўнымі сродкамі яе ажыццяўлення ў бібліятэцы для сляпых выступаюць дакументы (традыцыйныя і спецыяльных фарматаў) і стасункі.

Сацыяльна-педагагічная дзейнасць бібліятэкі для сляпых рэалізуецца праз своеасаблівую арганізацыю бібліятэчнай работы з выкарыстаннем сістэмы метадаў выхавання карыстальнікаў-інвалідаў па зроку. Педагагічная трыяда (навучанне, адукацыя, выхаванне) рэалізуецца ў бібліятэчных умовах спецыфічным чынам: папаўненне ведаў тут мае выхаваўчы характар, а фарміраванне маральных якасцей асобы неад’емна ад пазнання.

Мэтай бібліятэчнай работы з’яўляецца забеспячэнне свабоднага развіцця асобы, выключэнне розных формаў і метадаў бюракратычнага кіравання. Дакумент і бібліятэка павінны выступаць як адзін з фактараў пазнавальнай дзейнасці карыстальніка-інваліда па зроку. Праз узбагачэнне ведамі бібліятэка са- дзейнічае працэсам кампенсацыі і псіхалагічнай карэкцыі асобы, а таксама задавальненню інфармацыйных патрэб у адукацыйнай і прафесійнай дзейнасці сляпых і людзей, якія дрэнна бачаць, і ў найбольш шырокім плане – іх сацыялізацыі.

Спецыяльная бібліятэка для сляпых садзейнічае розным відам адукацыі карыстальнікаў, накіравана на іх духоўнае ўзбагачэнне і павышэнне культурнага ўзроўню, узмацненне пазнавальнага інтарэсу. Яна канцэнтруе ўвагу інвалідаў на сапраўдных чалавечых каштоўнасцях, маральных устоях грамадства, развівае індывідуальныя патрэбнасці асобы. Увесь адукацыйны патэнцыял, які назапашаны ў макра- і мікраасяроддзі, значна папаўняецца і пашыраецца ў бібліятэцы.

У параўнанні з адукацыйным асяроддзем, у аснову якога пакладзена атрыманне сістэматычных ведаў у межах канкрэтных вучэбных праграм, бібліятэчнае асяроддзе выступае крыніцай пазнання без межаў, таму што з'яўляецца часткай сусветнага культурнага працэсу і складае ў ім сваю долю і спецыфічную сферу дзейнасці.

Сістэма выхавання ў бібліятэцы для сляпых у значнай ступені садзейнічае працэсу фарміравання асобы. Яна заклікана трансліраваць па-сапраўднаму гуманістычныя ідэалы, выкарыстоўваць пры гэтым усе наяўныя сродкі. Немалаважная дэталь: эфектыўнасць выхаваўчага працэсу залежыць ад унутранай пазіцыі інваліда па зроку і супадзення яе з характарам знешніх уздзеянняў. У гэтым выпадку педагагічныя патрабаванні ўспрымаюцца добраахвотна, выклікаюць адпаведную актыўнасць і дазваляюць бібліятэчным супрацоўнікам актывізаваць асабісты патэнцыял сляпых і людзей, якія дрэнна бачаць, стымуляваць працэсы самаразвіцця і самаўдасканалення праз эстэтычнае, экалагічнае, маральнае, працоўнае ўзбагачэнне.

Такім чынам, бібліятэка для сляпых павінна забяспечыць спрыяльныя ўмовы для пашырэння адукацыйнага, выхаваўчага і творчага патэнцыялу карыстальнікаў-інвалідаў па зроку, актывізаваць працэсы ўзаемадапамогі і ўзаемападтрымкі паміж інвалідамі па зроку і тымі карыстальнікамі, якія добра бачаць, падтрымліваць культурна-бытавыя традыцыі, характэрныя для гэтай сацыяльнай групы. Бібліятэка стварае такія ўмовы з дапамогай сваіх спецыфічных формаў і метадаў работы, якія ажыццяўляюцца праз арганізацыю індывідуальнай і масавай работы. Пры гэтым дамінуючым з'яўляецца прынцып карэкцыйна-кампенсуючай накіраванасці бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку, абгрунтаваны тэарэтычнымі палажэннямі аб першасных дэфектах і другасных адхіленнях у развіцці, кампенсацыі і карэкцыі парушаных функцый.

Ведаючы сенсорныя і псіхафізічныя магчымасці дзяцей і дарослых карыстальнікаў-інвалідаў па зроку, бібліятэчныя супрацоўнікі выкарыстоўваюць разнастайныя формы і метады бібліятэчнага абслугоўвання, якія са- дзейнічаюць развіццю асобы, карэкцыі псіхалагічных якасцей. Пры гэтым, выкарыстоўваючы метады дыферэнцыраванага і індывідуальнага падыходу да карыстальнікаў, бібліятэкі садзейнічаюць і развіццю чытацкай дзейнасці інвалідаў па зроку шляхам сістэматычнага выяўлення іх чытацкага попыту і арганізацыі стасункаў па фарміраванні чытацкіх інтарэсаў, густаў. Пры разнастайнай індывідуальнай і масавай рабоце ў бібліятэцы для сляпых (гутаркі, літаратурна-музычныя вечарыны, дыспуты, чытанне ўголас, прэм'ера кнігі, агляды, конкурсы і інш.) павышаюцца бібліятэчна-бібліяграфічная кампетэнцыя карыстальнікаў-інвалідаў па зроку, самастойнасць адбору і выкарыстання імі інфармацыйнага патэнцыялу бібліятэкі ў сваіх адукацыйных і прафесійных мэтах. Такім чынам, павышаецца і ўзровень іх сацыяльнай рэабілітацыі.

У выніку сацыяльна-педагагічная дзейнасць бібліятэкі для сляпых заснавана на ўзаемным супрацоўніцтве, этычных адносінах бібліятэкара і карыстальніка. Яе мэта – выхоўваць у карыстальнікаў-інвалідаў па зроку інфармацыйную культуру, якая садзейнічае назапашванню сацыяльных ведаў і вопыту і дапамагае інваліду па зроку раскрыць уласныя магчымасці і здольнасці, адчуць сябе карысным членам грамадства. Сацыяльна-педагагічная дзейнасць бібліятэкі для сляпых павінна быць накіравана на інтэлектуальнае і маральнае ўзбагачэнне інвалідаў па зроку, аказанне ім сацыяльнай, культурнай і духоўнай дапамогі.

Такім чынам, спецыяльная бібліятэка для сляпых ажыццяўляе сацыяльна-педагагічную дзейнасць, выкарыстоўваючы розныя формы і метады. Яна заснавана на чытацкай дзейнасці, садзейнічае ўспрыманню карыстальнікамі-інвалідамі па зроку бібліятэкі як патэнцыяльнага развіваючага асяроддзя. У выніку ў сляпых і людзей, якія дрэнна бачаць, фарміруюцца сацыяльна значныя якасці, неабходныя для інтэграцыі ў соцыум.


1. *Арнольдов А.И.* Живой мир социальной педагогики. – М.: МГУК, 1999. – 116 с.

2. *Василькова Ю.В., Василькова Т.А.* Социальная педагогика: Курс лекций. – М.: Академия, 2000. – 440с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Стрельцов Ю.А.* Общение в сфере свободного времени: Учеб. пособие / Моск. гос. ин-т культуры. — М., 1991. – 118с.
4. *Терешин В.П.* Современные проблемы развития педагогических функций библиотек // Развитие педагогических функций советских библиотек: Межвуз. сб. науч. тр. / Моск. гос. ин-т культуры. — М., 1991. – С. 5—25.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ